о ШШШ>)Ъ1



Кандыдат філалагічных навук (1985). Скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1962). Настаўнічаў. З 1966 у Віцебскім універсітэце. Чытае спецкурс «Фальклор Віцебшчыны», узначальвае летнюю фалькл. практыку студэнтаў. Даследуе паэтычныя асаблівасці бел. радзіннай паэзіі. На Віцебшчыне і Магілёўшчыне запісваў розныя жанры і віды бел. вусна-паэтычнай творчасці: песні радзінныя, дзіцячыя, жніўныя, жартоўныя, зімовыя, веснавыя, купальскія, восеньскія, вясельныя, прыпеўкі, замовы і інш. Яго фалькл. запісы папоўнілі тамы серыі БНТ «Радзінная паэзія» (1971), «Дзіцячы фальклор» (1972), «Жніўныя песні» і «Жартоўныя песні» (абодва 1974), «Зімовыя песні» (1975), «Прыказкі і прымаўкі» (кн. 2, 1976), «Веснавыя песні» (1979), «Вяселле. Песні» (кн. 1—6, 1980—88), «Восеньскія і талочныя песні» (1981), «Сацыяльна-бытавыя песні» (1984), «Купальскія і пятроўскія песні» (1985), «Прыпеўкі» (1989), «Замовы» і «Паэзія беларускага земляробчага календара» (абодва 1992), «Жаніцьба Цярэшкі» (1993).

*Тв.:* Эўфанія беларускай радзіннай паэзіі // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1984. №5; Пантарыфма ў паэзіі беларускіх радзін // Весці Віцебскага дзярж. ун-та. 1999. №1; Выклічнікі ў эмацыянальна-вобразнай мове радзінных песень // Там жа. 2001. №2; Паэтыка хрэсьбінных песень // Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка. Мн., 2001. Кн. 2. Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр.

*І. У. Саламевіч.*

**ЕРАТНІКІ́**, міфічныя істоты, у якіх бачылі былых ведзьмароў і ведзьмаў, што перад смерцю хацелі адрачыся ад сваіх агідных паводзін, але не атрымалі дазволу сваіх уладароў — чарцей. Згубную дзейнасць Е. праводзяць ад вячэровых прыцемкаў да світання. Штоночы яны павінны падпільноўваць на дарогах запозненых падарожнікаў і мучыць людзей у іх дварах і пабудовах. Е. раптоўна абхоплівае ахвяру абеadmiruч ці хапае яе за горла і трымае, пакуль тая не сканае. Пасля гэтага нячысцік, нацешыўшыся пакутамі ахвяры, выпівае цёплую кроў, а цела нявечыць. Е. няшмат, і ў бойцы яны неміласэрна грызуцца, драпаюцца, душаць адзін аднаго, і пры гэтым ні адзін з іх ніколі не застаецца цэлы. Е., не баючыся грамавых стрэл, могуць быць параненыя вострымі металічнымі рэчамі і хутка гінуць ад уколаў і парэзаў. Гэтак людзі зжываюць іх са свету. Памерлы Е. ператвараецца ў смярдзючы прах, які разбуральна дзейнічае на здароўе людзей і жывёл, трапляючы праз ежу і пітво ў цела. Е. з'яўляюцца мадыфікаваным вобразам *вупыроў*.

*Літ.:* Никифоровский Н.Я. Нечистики, свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе. Витебск, 1995. С. 61—62.

*У. А. Васілевіч.*

**ЁЎНІК**, Асетнік, сядзібны дух, які жыве ў ёўні (асеці), у печы ці на печы. Блізкі сваяк *Лазніка*, з якім яднаецца агнявым паходжаннем, і *Дамавіка*, ад якога ён адрозніваецца толькі тым, што з'яўляецца не ў белай вопратцы, а ўвесь чорны ад дыму, з вачыма, што палаюць, нібы вуголлі. Часцей Ё. нябачны для людзей, але калі робіцца бачны, то ўяўляе чалавекападобную масу, дзе праз сажу, пыльнае павуціннe і наліплую мякіну нельга разгледзець яго асобныя формы. Ё. рупіцца, каб правільна палілася сушыльная печ і сушыліся снапы і зерне, пасылае патрэбны для веяння скразняк, памагае спорыць работу. Калі ў сушні апрацоўваецца лён ці пянька, ён памагае каля мялкі і трапалкі. Любіць Ё., калі сушня замяняе лазню, і можа змыць з сябе сажу і пыл. Ё. рэдка пакідае печ ці сушыльную жэрдку і робіць гэта толькі тады, калі трэба агледзець ток, склады снапоў, паназіраць за малацьбою і работнікамі або калі неабходна выкашляць пыл і сажу. Калі асець наведваюць непатрэбныя асобы, Ё. палохае іх, а ненавісніка можа задушыць чадам ці нават спаліць разам з дабром. Ё. не баіцца звычайнага агню і можа спакойна збоку назіраць за пажарам, каб потым вярнуцца на сваю печ ці на абгарэлае бервяно і жыць да адбудавання новай асеці. Аднак Ё. можа загінуць у пажары ад маланак: мякінны пыл імгненна ўспыхвае, і Ё. згарае, не пакідаючы пасля сябе ні пылінкі. Іншы Ё. не пойдзе ў ёўню, адбудаваную на тым самым месцы: пабудова астаецца без нячысціка. Каб задобрыць Ё., прыносяць яму ахвяру, пры насаджванні ёўні кідаюць у агонь адзін сноп, каб Ё. «была занятка». Калі ж угнявіць яго, ён сам пачынае паліць снапы і ёўню.

*Літ.:* Беларуская міфалогія / Уклад. У.А.Васілевіч. Мн., 2002. С. 41—42.

*У. А. Васілевіч.*



*А. С. **Емяльянаў**.*

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ